

Пра спаленыя вёскі на Любаншчыне расказаў Сяргей КВІТКЕВІЧ.

ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ

# Балючая рана

**Наша краіна і народ перажылі нямала трагічных падзей. Але, бадай, самай страшнай з іх стала Вялікая Айчынная вайна, небывалая па сваіх маштабах і жорсткасці.**

Яна прынесла цяжкія выпрабаванні, значныя матэрыяльныя і культурныя страты. І самае непапраўнае – мільённыя чалавечыя ахвяры.

Шмат гора ўчынілі беларусам фашысцкія акупанты. Гэта нельга перакрэсліць і забыць – гэта наша балючая рана. І вельмі важна, каб усе не толькі памяталі пра цану перамогі, але і спрыялі таму, каб ліхалецце больш не паўтарылася на нашай зямлі.

Якраз пра тое і разважалі ўдзельнікі дыялогавай пляцоўкі «Генацыд не мае тэрміну даўнасці», што ладзілася ў раённым Цэнтры культуры. Навучэнцы гарадскіх устаноў адукацыі разам са спікерамі, старшым памочнікам пракурора Юрыем Малочка, навуковым супрацоўнікам музея народнай славы Сяргеем Квіткевічам, настаўнікам Гімназіі №1 Вольгай Паповай, перагарнулі старонкі крывавага мінулага, узгадалі хатынскую трагедыю, што, як і шматлікія вёскі, знішчаныя ў гады Вялікай Айчыннай разам з іх жыхарамі, стала сімвалам мужнасці і гераізму народа, яго непакорлівасці карычневай чуме.

ІДЭАЛОГІЯ

# Прыярытэтныя напрамкі

**Чарговая інструктыўна-метадычная нарада стала пляцоўкай для абмеркавання ідэалагічным актывам раёна актуальных тэм. Галоўная з іх – «Рэспубліка Беларусь: праекты будучага».**





Ганаровую грамату за асабісты ўклад ва ўмацаванне міру атрымала медсястра Алена РАДЗІВІЛІНА.

Адзначана, што абраны ў свой час курс дазволіў нашай краіне пазбегнуць значных узрушэнняў, захаваць і прымножыць дасягненні савецкага перыяду, забяспечыць незалежнасць у ключавых галінах – у прамысловасці, энергетыцы, сельскай гаспадарцы, ахове здароўя і іншых. І нават у той няпростай сітуацыі, што склалася ў апошнія гады на міжнароднай арэне, у нас паранейшаму кожнаму гарантаваны праца і адпаведная заработная плата, даступная адукацыя і медыцына, дапамога ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Дзеля ўмацавання эканамічнай бяспекі ў рэспубліцы рэалізуецца шэраг праектаў і праграм, скіраваных, так бы мовіць, у будучыню. Так, актыўна развіваецца атамная энергетыка, якая павінна забяспечыць не толькі камфортныя ўмовы для пражывання, а і захаваць навакольнае асяроддзе: БелАЭС знізіць выкіды парніковых газаў. Стаўка робіцца і на біятэхналогіі, перш за ўсё ў медыцыне і аграрным сектары, штучны інтэлект, з дапамогай якога магчыма распрацоўка спецыяльных прылажэнняў для забеспячэння кібербяспекі, складаных сістэм для меддыягностыкі і інш. Чакаецца, што гэтыя накірункі стануць драйверамі росту айчыннай эканомікі ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі.

Звярнулі ўвагу ўдзельнікі нарады і на негатыўныя праявы рэчаіснасці, якія неабходна выкараняць. Гэта такія, як карупцыя (на Любаншчыне летась было зарэгістравана 5 такіх злачынстваў, у асноўным у сельскай гаспадарцы), наркаманія (мелі месца 4 факты, у тым ліку 3 – захоўванне, перавозка наркатычных сродкаў, 1 – вырошчванне раслін, якія ўтрымліваюць наркатычныя рэчывы).

Таксама гаворка ішла пра добраўпарадкаванне. Для гэтага, падсумавала начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Таццяна Аляксеева, самы час. Тым больш аб'яўлены месячнік па навядзенні парадку на зямлі, зацверджаны раённы план мерапрыемстваў.

Варта дадаць, акрэсленыя пытанні на гэтым тыдні разглядаліся і ва ўсіх працоўных калектывах. У прыватнасці, у Любанскай ЦРБ з удзелам Максіма Місько, старшыні праўлення грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру». Ён не толькі выступіў перад работнікамі, а і ўручыў узнагароды некаторым з іх. Таксама наведаў палаты для ветэранаў у хірургічным і інфекцыйным аддзяленнях, на абуладкаванне якіх фондам выдзелена звыш 10 тыс. руб.

ГЕНОЦИД

# Плачут малые дети Хатыни...

**22 марта по всей стране проходят памятные мероприятия, приуроченные к годовщине трагической гибели жителей д. Хатынь, замученных немецко-фашистскими захватчиками. Уничтоженная огнем деревня стала собирательным образом и символом скорби по всем погибшим в самых жестоких и несправедливых актах насилия в отношении мирного населения во время Второй мировой войны. Ведь Хатынь собрала пепел всех деревень, сожженных безжалостным врагом на территории нашей многострадальной Родины.**





Несмотря на то, что с победы над фашизмом прошло уже почти восемьдесят лет, выявляются все новые и новые факты военных преступлений, пострадавшими в которых являются не только граждане нашей страны, но и целые населенные пункты. Уголовное дело, возбужденное Генеральной прокуратурой Республики Беларусь по геноциду белорусского народа, стало весомым основанием для принятия ряда законов, таких как «О геноциде белорусского народа» и «О недопущении реабилитации нацизма». За нарушение пунктов последнего в отношении одного из граждан нашей страны, который в своих высказываниях осуждал деятельность партизан и восхвалял «человечность» фашистов, возбуждено уголовное дело.

Это говорит о том, что нынешнее поколение, которому, к счастью, не пришлось пережить всех ужасов войны с «добрыми» немцами, по словам отдельных «очевидцев», угощавшими детей конфетами, стало забывать или относится с пренебрежением к урокам истории.

– В ходе расследования уголовного дела о геноциде белорусского народа только на Любанщине установлено не менее 15 населенных пунктов, которые были полностью или частично сожжены во время Великой Отечественной войны. Всего же этот список состоит более чем из 60 названий сел и деревень, – отметил прокурор Любанского района Дмитрий Дешук.

Сегодня основным направлением деятельности органов прокуратуры является осмотр и анализ актов Чрезвычайной государственной комиссии, которая действовала с 1943 по 1953 годы, о злодеяниях немецко-фашистских захватчиков и причиненном ущербе по Бобруйской области (в состав которой входил и наш район). Благодаря вносимым сведениям о лицах расстрелянных, повешенных, замученных, угнанных в неволю аналитическая база материалов о геноциде постоянно пополняется. Сегодня имеются данные об убийстве более двух с половиной тысяч мирных жителей, среди которых несовершеннолетние.

– Работа кропотливая и требует максимум усилий, чтобы по возможности ни один факт преступления не остался без внимания правоохранителей и все преступники понесли заслуженное наказание. Уже установлено 15 ранее неизвестных граждан, перешедших на сторону немцев и оказывавших тем содействие в убийстве мирных граждан. В основном данные изменники действовали на территории нынешних Малогородятического и Кузьмичского сельсоветов, – подытожил Дмитрий Сергеевич.

Данная работа проводится в каждом из районов нашей страны. Так, 18 марта Верховный Суд признал палача белорусского народа Владимира Катрюка виновным в совершении геноцида, а именно в совершении преступления, предусмотренного ст. 127 (геноцид) Уголовного кодекса Беларуси. В отношении него вынесен обвинительный приговор без назначения наказания. Рассмотрение дела началось еще 8 февраля. В ходе судебного процесса доподлинно установлено, что Катрюк осенью 1941 года добровольно вступил в организацию украинских националистов, а затем (не позднее января 1943 года) вошел в состав 118-го батальона охранной полиции, который совместно с немецкой ротой зондербатальона СС «Дирлевангер» осуществил 22 марта 1943 карательную операцию в Хатыни.

После войны, в 1951 году, Катрюк скрылся на территории Канады, где тихо-мирно прожил до 93 лет и, избежав справедливого наказания за расправы над людьми, умер в 2015 году. Но сколько бы времени ни прошло, такие преступления не имеют срока давности.